Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

22 сакавіка 2017 года, № 4 (2172)

ПАДЗЕЯ

# 500 гадоў з беларускай кнігай

Факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» было перададзена рэктару Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ, Мітрапаліту Мінскаму і Заслаўскаму Паўлу, Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі, падчас святкавання Дня праваслаўнай кнігі. На свяце адбылася і цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу літаратурных і даследчых работ школьнікаў, прымеркаванага да 500-годдзя выдання Бібліі Францыскам Скарынам і праведзенага Інстытутам тэалогіі.



Фота Аляксандра МЯЗЕЯ

*Мітрапаліт Павел узнагароджвае пераможцаў творчага конкурсу*

10 сакавіка ў Нацыянальнай бібліятэцы свята адбывалася з раніцы да вечара: у галерэі «Ракурс» высокіх гасцей і наведнікаў чакалі майстэрня па перапісванні кнігі, заняткі па каліграфіі, выстава беларускіх праваслаўных выдавецтваў, сустрэчы з аўтарамі духоўнай літаратуры і нават літаратурная кавярня з манастырскімі прысмакамі. Аздобай свята сталі выступленні ансамбля скрыпачоў «Сугучча» гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка і дзіцячага хору пры нядзельнай школе Свята-Елісавецінскага манастыра.

Дырэктар галоўнай бібліятэкі краіны прэзентаваў знакавае выданне, растлумачыўшы, чаму, што і для каго было зроблена.

## З усяго свету па старонцы

**Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі:**

– Першая кніга, надрукаваная беларусам для беларусаў, была кніга Свяшчэннага Пісання. Наш зямляк Францыск Скарына 500 гадоў таму зрабіў невыпадковы выбар з адной мэтай: каб Слова Божае яго землякі маглі чытаць на зразумелай ім мове. Выконваючы яго волю, яго дзеці – кнігі – разышліся па ўсім свеце.

Мы пачалі рыхтавацца да гэтага свята 10 гадоў таму і вырашылі спярша даведацца: а дзе ж кнігі Скарыны цяпер? Як высветлілася, не толькі ў Беларусі ці ў нашых найбліжэйшых суседзяў. Якраз у Беларусі іх апынулася вельмі мала. Такі лёс гэтай зямлі... Скарынаўскія кнігі раз'ехаліся па ўсім свеце, пераплылі мора і трапілі ў Англію, пераплылі акіян, каб дабрацца ў Злучаныя Штаты. Як бы вярнуць гэтыя кнігі на радзіму? Як даць магчымасць нашым сучаснікам прачытаць іх разам? Па старонцы з усяго свету, год за годам мы аднаўлялі гэту спадчыну – і сабралі 20 тамоў усіх друкаваных кніг Скарыны ў адным выданні.

Калі пачынаўся гэты праект, было шмат тых, хто сумняваўся ў яго паспяховасці, бо мэту мы сабе паставілі амаль немагчымую. Задавалі шмат пытанняў, і сярод іх было адно, якое паставіла мяне ў тупік: «А навошта?». Я, прызнаюся, разгубіўся і не адказаў, а пазней адказ знайшоўся, і вельмі просты: тое, што напісана ў Бібліі, тыя запаветы не састарэлі для нас і ніколі не састарэюць, колькі б стагоддзяў і тысячагоддзяў ні прайшло. На жаль, за тыя пяцьсот гадоў, якія прайшлі з выдання кніг Францыскам Скарынам, людзі не сталі значна лепшымі, і запаведзі «Не забі», «Не ўкрадзі», «Не сведчы лжыва» і іншыя – усё гэтак жа актуальныя. Выдаючы кнігу, мы хацелі нагадаць усім вярнуцца да гэтых вядомых запаведзяў.

Пачытаўшы прадмовы і каментарыі Скарыны, мы бачым, што ён выдаваў свае кнігі ў першую чаргу для моладзі – для тых, хто пачынае жыццё, выбірае арыенціры. Сімвалічна, што мы перадаем першую кнігу нашага шматтомнага факсімільнага выдання студэнтам.

## Чалавек з вялікай літары

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, рэктар Інстытута тэалогіі імя Мяфодзія і Кірыла БДУ:**

– Так, я таксама разгубіўся б, каб у мяне так спыталі: навошта такое выданне? У такіх выпадках звычайна кажу: хачу, каб і ў мяне былі такія кнігі, і не толькі ў мяне, але і ва ўсіх нас. Хачу, каб тое, што ствaралася на нашай роднай зямлі нашымі землякамі, папярэднімі пакаленнямі, захоўвалася і прыносіла карысць. Бо, сапраўды, мы застаемся такімі самымі. Але, чытаючы гэту кнігу, мы павінны – закліканы – стаць лепшымі. Стаць дабрэйшымі, святымі. Стаць чалавекам з вялікай літары, богападобным. Якраз гэтая кніга будзе спрыяць працэсу богапрыпадаблення, удасканалення кожнага чалавека. Канечне, перадам гэту кнігу ў бібліятэку сваёй навучальнай установы, і мы станем у чаргу за наступнымі тамамі.

## Конкурс

Творчыя конкурсы сярод школьнікаў Інстытут тэалогіі ладзіць ужо адзінаццаты год. Да юбілею беларускай кнігі інстытут падрыхтаваў два мерапрыемствы: выязны лекторый музея Бібліі па школах краіны і ўласна конкурс літаратурных і даследчых работ, у якім гэтым разам узялі ўдзел каля 200 школьнікаў. Суарганізатарамі выступілі Нацыянальная бібліятэка і выдавецкі савет Беларускай праваслаўнай царквы.

У літаратурнай намінацыі ***«Мастацкая проза»*** перамаглі: Мікіта Віславух (СШ № 5, г. Жодзіна) і Наталля Гусік (СШ № 30 імя Д. Б. Гвішыяні, г. Брэст), у намінацыі «Паэзія» – Улада Быкава (СШ № 40, г. Магілёў) і Ганна Верабей (СШ № 2, г. Слаўгарад). Прызавыя месцы ў намінацыі ***«Публіцыстыка»*** занялі Вераніка Лукашэвіч (Сочыўкаўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа, Брэсцкая вобл.) і Паліна Свірыдзенка (СШ № 17 імя Франсіска дэ Міранды, г. Гомель). Найлепшымі творамі ў намінацыі ***«Драматургія. Сцэнарыі лялечнага тэатра «Батлейка»*** прызнаны працы Дыяны Грышынай (СШ № 16, г. Ліда) і Лізаветы Лісоўскай (СШ № 10, г. Пінск).

**(Заканчэнне на с. 3)**

## У нумары:

ЖАНЧЫНЫ ГОДА АБВЕШЧАНЫ Ў БДУ
На ўрачыстай цырымоніі ў нашым універсітэце падведзены вынікі конкурсу «Жанчына года БДУ», які праводзіўся ўпершыню
*Стар. 2–3*

СТУДГАРАДКУ ПРАПАНАВАЛІ...
На сустрэчы прафсаюзнага актыву з дырэктарам студгарадка Алай МЕЛЕХ абмяркоўваліся ўмовы пражывання ў інтэрнатах БДУ
*Стар. 4*

## Весткі з рэктарата

**ДЭЛЕГАЦЫЯ БДУ** на чале з рэктарам акадэмікам Сяргеем Абламейкам з 17 па 20 лютага наведала КНР. У Пекіне на калегіі Міністэрства адукацыі адбылася паспяховая абарона праекта па стварэнні Беларуска-Кітайскага інстытута на базе БДУ і Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта. Пасля гэтага прадстаўнікі БДУ нанеслі візіт у Далянь, дзе на сустрэчы з кіраўніцтвам і грамадскасцю абмеркавалі ўмовы дзейнасці сумеснага інстытута.

**СТАРШЫНЯ** Мажыліса Парламента Рэспублікі Казахстан Нурлан Нігматулін выступіў 16 сакавіка перад выкладчыкамі і студэнтамі БДУ. Ён распавёў пра эканамічныя дасягненні Казахстана і развіццё супрацоўніцтва з Беларуссю, а таксама адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

**ПРАДСТАЎНІКІ** Дзяржаўнага ўніверсітэта г. Кальяры (Сардзінія) на чале з прарэктарам па міжнародных адносінах Алесандра Каручы наведала БДУ.

На сустрэчы з прарэктарам па навуковай рабоце БДУ Васілём Сафонавым, начальнікам ГУН Віталем Кутавічусам, начальнікам УМС Вадзімам Рэзнікавым і загадчыкам кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій ФРКТ Уладзімірам Саечнікавым італьянскім калегам прадставілі інфармацыйна-вымяральныя сістэмы і прыборы, распрацаваныя на ФРКТ і выробленыя на «Унітэхпраме БДУ». Госці наведалі Цэнтр аэракасмічнай адукацыі БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

*Каб скарыстацца мультымедыйным кантэнтам газеты:*

*1. Загрузіце на смартфон прыкладанне **Aurasma***
*2. Падпішыцеся на канал **#bsuby***
*3. Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*

# Жанчыны года абвешчаны

**У юбілейным 2016 годзе ў нашым універсітэце стартаваў конкурс «Жанчына года БДУ», які праводзіўся ўпершыню. Сімвалічна, што імёны пераможцаў і лаўрэатаў былі названы на ўрачыстай цырымоніі ў самым пачатку вясны.**


Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

*Лаўрэаты конкурсу «Жанчына года БДУ»*



*Дыпламанты конкурсу «Жанчына года БДУ»*

Конкурс адбыўся па ініцыятыве савета ГА «Саюз жанчын БДУ» сярод членаў арганізацыі па пяці намінацыях: навуковыя дасягненні, навукова-метадычныя дасягненні, кіраўнічая праца, праца са студэнтамі, найлепшы работнік (найлепшы ў прафесіі). У кожнай намінацыі былі вызначаны па 3 лаўрэаты і адзін пераможца. У журы ўваходзілі члены савета Саюза жанчын БДУ, прарэктары, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, кіраўнікі падраздзяленняў БДУ, а таксама незалежныя эксперты.

На ўдзел у конкурсе было атрымана больш за 100 заявак. Пасля адбору ў адпаведнасці з крытэрыямі намінацый у фінал конкурсу выйшлі 27 чалавек. З іх – 5 пераможцаў, 10 лаўрэатаў і 12 фіналістаў-дыпламантаў конкурсу. У конкурсе бралі ўдзел і вылучалі кандыдатуры: геаграфічны факультэт, галоўнае ўпраўленне навучальнай і навукова-метадычнай работы, Інстытут журналістыкі, механіка-матэматычны факультэт, студэнцкі гарадок, упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, факультэт міжнародных адносін, факультэт філасофіі і сацыяльных навук, фізічны факультэт, філалагічны факультэт, Фундаментальная бібліятэка, хімічны факультэт, юрыдычны факультэт. Правядзенне дадзенага конкурсу выклікала вялікую цікавасць універсітэцкай грамадскасці.

Урачысты фінал конкурсу «Жанчына года БДУ» і цырымонія ўзнагароджання адбыліся 2 сакавіка ў актавай зале ліцэя, дзе не было вольных месцаў. Фіналістаў прыйшлі павіншаваць іх кіраўнікі, калегі, студэнты, сем'і. Ушанаванне найлепшых жанчын года БДУ шырока асвятлялася ў СМІ. У цырымоніі прынялі ўдзел: рэктар акадэмік С. У. Абламейка, прарэктар па навучальнай і выхаваўчай рабоце У. В. Сувораў, старшыня мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі М. П. Пазнякоў, прадстаўнікі пасольства Казахстана ў Беларусі і Нацыянальнага агенцтва па турызме.

Усе фіналісты атрымалі прызы і падарункі ад Саюза жанчын БДУ. Сярод пераможцаў і лаўрэатаў таксама былі разыграныя бясплатныя турыстычныя пуцёўкі – паездка ў Еўропу па маршруце Бельгія–Галандыя, прадстаўленая турыстычнай кампаніяй «Турлюкс», і паездка па Беларусі «Архітэктурныя і гістарычныя помнікі Міра і Нясвіжа» ад кампаніі «Белагратрэвэл». Дыпламанты ж адправяцца на эксклюзіўную экскурсію па Мінску з найлепшым экскурсаводам года Сяргеем Бусько.

Фінал конкурсу завяршыў святочны канцэрт, у арганізацыі якога вялікую дапамогу аказала *«Настаўніцкая газета»* і асабіста намеснік галоўнага рэдактара ***У. У. Фалалееў***, які разам са старшынёй савета ГА «Саюза жанчын БДУ» ***І. В. Казаковай*** былі бліскучымі вядучымі ўсёй урачыстай цырымоніі.

## ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ «ЖАНЧЫНА ГОДА БДУ»:

### НАМІНАЦЫЯ НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ



**Таццяна РУМЯНЦАВА,** доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры філасофіі культуры ФФСН.

Таццяна Румянцава на працягу многіх гадоў выкладае на факультэце філасофіі і сацыяльных навук, яна ўкараніла ў навучальны працэс цэлы шэраг аўтарскіх курсаў і спецкурсаў для студэнтаў-філосафаў і гуманітарыяў БДУ. Яна актыўна займаецца навуковай працай, публікуе артыкулы, навукова-метадычныя і навучальныя дапаможнікі, слоўнікі, манаграфіі, змест якіх знаходзіць сваё адлюстраванне і практычную рэалізацыю ў адукацыйным працэсе. Удзельнічае ў працы міжнародных канферэнцый. Агульная колькасць апублікаваных ёю прац – 555. Сярод іх 8 манаграфій і 5 навучальных дапаможнікаў (два апошня выйшлі ў 2014 і 2015 гг.), вялікая колькасць навуковых артыкулаў, у тым ліку і ў прэстыжных часопісах і зборніках Расіі і далёкага замежжа.

### НАМІНАЦЫЯ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫЯ ДАСЯГНЕННІ



**Святлана ГАНЧАРОВА-ГРАБОЎСКАЯ,** доктар філалагічных навук, прафесар, загадчыца кафедры рускай літаратуры філалагічнага факультэта.

Асноўныя кірункі навуковай працы – гісторыя рускай літаратуры, паэтыка жанраў драматургіі. Адмысловы ўнёсак зрабіла ў распрацоўку тэорыі камедыі, трагікамедыі, камедыі-памфлета. Вялікая частка прац прысвечана рускай і беларускай драматургіі XX–XXI стст. (5 манаграфій, 10 навучальных дапаможнікаў, каля 300 артыкулаў). Міжнароднае прызнанне атрымала сярод літаратуразнаўцаў Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Літвы, Славакіі, Англіі, пра што сведчаць рэцэнзіі на яе публікацыі кніг і артыкулаў за мяжой, а таксама актыўнае цытаванне і спасылкі на навуковыя працы.

С. Я. Ганчарова-Грабоўская – лаўрэат прэміі У. Пічэты (2016) за навучальна-метадычны комплекс: «Сучасная руская драматургія» і «Сучасная беларуская (рускамоўная) драматургія». Да іх прыкладаецца зборнік навуковых артыкулаў, выдадзены таксама пад рэдакцыяй С. Я. Ганчаровай-Грабоўскай.

### НАМІНАЦЫЯ КІРАЎНІЧАЯ ПРАЦА



**Людміла ХУХЛЫНДЗІНА,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт, начальнік Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы БДУ.

Досвед кіраўнічай працы з 1978 г. Прымала актыўны ўдзел у стварэнні факультэта міжнародных адносін і з 1995 па 2006 г. працавала намеснікам дэкана ФМА. З 2006 г. – начальнік ГУВНМР. Кіравала распрацоўкай адукацыйных стандартаў, тыпавых і навучальных планаў трэцяга пакалення па ўсіх спецыяльнасцях БДУ.

Л. М. Хухлындзіна – прафесар кафедры міжнародных адносін. Пад яе кіраўніцтвам абаронена 4 кандыдацкія дысертацыі. Аўтар больш як 140 публікацый.

Удзельнічае ў правядзенні круглых сталоў у РІВШ па адукацыйных праграмах павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, а таксама для спецыялістаў, якія займаюцца арганізацыяй навучальнага працэсу ва УВА краіны.

Пры яе непасрэдным удзеле ў БДУ створана Сістэма менеджменту якасці, якая адпавядае патрабаванням ISO 9001. Л. М. Хухлындзіна – член нацыянальнай групы экспертаў па Балонскім працэсе.

Ганаравана медаля «За працоўныя заслугі» (2011) і звання «Заслужаны работнік БДУ» (2010). У 2016 годзе яна ўзнагароджана Ганаровай граматай Савета Міністраў і падзякамі міністра адукацыі Беларусі і рэктара БДУ.

### НАМІНАЦЫЯ ПРАЦА СА СТУДЭНТАМІ



**Анжаліка САДОЎСКАЯ,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы філалагічнага факультэта.

Чытае аўтарскія курсы «Беларуская этналінгвістыка», «Нацыянальна-культурны кампанент беларускай фразеалогіі», «Тэорыя і практыка перакладу фразеалагізмаў», з'яўляецца аўтарам манаграфіі «Фразеалагізмы з кампанентам-арнітонімам у беларускай мове: этналінгвістычны аспект», кіраўніком фундаментальнай навуковай тэмы «Беларуская мова і традыцыйная духоўная культура: праблемы метадалогіі і лексікаграфічнае апісанне», кіраўніком студэнцкага гуртка «Роднае слова», які стаў пераможцам конкурсу навуковых гурткоў БДУ–2016 у галіне гуманітарных навук.

Пад кіраўніцтвам А. Л. Садоўскай апублікавана больш за 70 студэнцкіх навуковых работ, у тым ліку і ў замежных выданнях, падрыхтавана больш за 100 навуковых дакладаў студэнтаў, прад-

# ў БДУ

стаўленых на ўніверсітэцкіх, рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях; яе вучні станавіліся пераможцамі рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў, гасцямі перадач Першага канала Беларускага радыё і радыё «Сталіца», уладальнікамі імянных стыпендый імя Янкі Купалы, Івана Шамякіна, Івана Навуменкі, у розныя гады былі занесены на Дошку гонару БДУ і інш.

НАМІНАЦЫЯ
НАЙЛЕПШЫ РАБОТНІК
(НАЙЛЕПШЫ Ў ПРАФЕСІІ)



**Наталля КАРБАНОВІЧ** – загадчыца аддзела камплектавання інфармацыйных рэсурсаў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.

Наталля Леанідаўна самастойна распрацавала вялікую колькасць арганізацыйных і тэхналагічных дакументаў як на ўзроўні аддзела, так і Фундаментальнай бібліятэкі. З'яўляецца адным з распрацоўшчыкаў Беларускага камунікатыўнага фармату прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у машыначытальнай форме (BELMARC). Шмат сіл і ўвагі Наталля Леанідаўна надае працы з маладымі спецыялістамі. На працягу 16 гадоў з'яўляецца кіраўніком вытворчай практыкі студэнтаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БГУКІ.

**ЛАЎРЭАТЫ КОНКУРСУ «ЖАНЧЫНА ГОДА БДУ»**

НАМІНАЦЫЯ
НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ:

- загадчыца кафедры фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій геаграфічнага факультэта, доктар геаграфічных навук, прафесар **Ядзвіга ЯЛОВІЧАВА**
- прафесар кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі доктар філалагічных навук **Таццяна АРЛОВА**

НАМІНАЦЫЯ
НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ ПРАЦА:

- загадчыца кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Інстытута журналістыкі, прафесар, доктар філалагічных навук **Таццяна ДАСАЕВА**
- прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта доктар юрыдычных навук **Таісія ДОЎНАР**

НАМІНАЦЫЯ
КІРАЎНІЧАЯ ПРАЦА

- загадчыца кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта, дацэнт, кандыдат філалагічных навук **Таццяна КАЗАКОВА**
- дырэктар Студэнцкага гарадка **Ала МЕЛЕХ**

НАМІНАЦЫЯ
ПРАЦА СА СТУДЭНТАМІ

- начальнік аддзела маладзёвых праграм і праектаў УВРМ **Наталля КАПАЦЭВІЧ**
- дацэнт кафедры біяфізікі фізічнага факультэта кандыдат біялагічных навук **Алена КАВАЛЕНКА**

НАМІНАЦЫЯ
НАЙЛЕПШЫ РАБОТНІК

- начальнік службы засялення і рэгістрацыі Студэнцкага гарадка БДУ **Алена ВАСІЛЬЕВА**
- начальнік навучальнага цэнтра інфармацыйных тэхналогій філалагічнага факультэта **Ганна ХАЙРОВА**

**ДЫПЛАМАНТЫ КОНКУРСУ «ЖАНЧЫНА ГОДА БДУ»**

НАМІНАЦЫЯ
НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ ПРАЦА:

- дацэнт кафедры агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі геаграфічнага факультэта кандыдат геаграфічных навук **Юлія ГЛЯДКО**
- дацэнт кафедры тэорыі функцыі ММФ кандыдат фіз.-мат. навук **Вольга ДАЛГАПОЛАВА**
- дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі ФФСН кандыдат філасофскіх навук **Наталля КІСЕЛЬ**
- дацэнт кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі фізічнага факультэта кандыдат фіз.-мат. навук **Алена МЕЛЬНІКАВА**

НАМІНАЦЫЯ
КІРАЎНІЧАЯ ПРАЦА:

- намеснік дэкана па навуковай працы ФМА, дацэнт, кандыдат эканамічных навук **Вольга МАЛАШАНКАВА**
- намеснік дырэктара Інстытута журналістыкі, загадчыца кафедры перыядычнага друку, дацэнт, кандыдат філалагічных навук **Вольга САМУСЕВІЧ**

НАМІНАЦЫЯ
ПРАЦА СА СТУДЭНТАМІ:

- загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі, дацэнт, кандыдат філалагічных навук **Людміла САЯНКОВА**
- дацэнт кафедры раманскіх моў ФМА кандыдат філалагічных навук **Таццяна САЛАДОЎНІКАВА**
- старшы выкладчык кафедры псіхалогіі ФФСН **Галіна ФАФАНАВА**
- старшы выкладчык кафедры неарганічнай хіміі хімічнага факультэта **Жанна ЦАБКАЛА**

НАМІНАЦЫЯ
НАЙЛЕПШЫ РАБОТНІК:

- вядучы бібліятэкар аддзела гуманітарна-асветніцкай працы і папулярызацыі кніжных помнікаў ФБ БДУ **Ірына ШКІРОНАК**
- вядучы спецыяліст дэканата факультэта міжнародных адносін **Людміла МУСЛІМАВА**

**Паводле інфармацыі Саюза жанчын БДУ**

ПАДЗЕЯ

# 500 гадоў з беларускай кнігай

**(Заканчэнне. Пачатак на с. 1)**

***Конкурс даследчых прац*** вызначыў шэсць пераможцаў у трох намінацыях: «Духоўныя сюжэты ў творах беларускай літаратуры», «Выявы Святога Пісання ў творах беларускага мастацтва» і «Роля хрысціянства ў гісторыі кнігі і кнігадрукавання Беларусі». Сярод пераможцаў: Ангеліна Дайлідзёнак і Дзмітрый Гмір (Крулеўшчынская СШ, Докшыцкі р. Віцебскай вобл.) і Юлія Асіпчук (СШ № 14, г. Пінск), Марыя Галаўчук (гімназія г. Іванава, Брэсцкая вобл.) і Дыяна Куксарава (СШ № 2, г. п. Круглае, Магілёўская вобл.), Марк Кодзенеў (гімназія № 1, г. Мінск), Марыя Кохан, Мацвей Рамейка і Дар'я Праўлоцкая (гімназія № 2, г. Баранавічы).

Дыпломы лаўрэатам, падзякі настаўнікам і каштоўныя падарункі вучням уручылі першы прарэктар Інстытута тэалогіі іерэй *Алег Голубеў* і прарэктар па вучэбнай рабоце *Ірына Латушка*. Пасля ўсіх вучняў і педагогаў была зладжана падрабязная экскурсія па Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Дыпломы 1 ступені пераможцам уручаў сам Уладыка Павел у рамках урачыстага свята.

Як адзначаюць арганізатары, такія конкурсы спрыяюць фарміраванню гістарычнай свядомасці, духоўна-маральных якасцяў асобы, выхаванню патрыятызму і грамадзянскасці навучэнцаў на грунце духоўных і культурных традыцый беларускага народа. Апроч гэтага, заўважае Алена ШЫМБАЛЁВА, начальнік службы па сувязях з грамадскасцю і інфармацыйна-аналітычнай рабоце Інстытута тэалогіі БДУ, самі навучэнцы дзякавалі за ўвагу ад вядучай ВНУ краіны, за магчымасць стаць заўважнымі для свайго кіраўніцтва, а таксама магчымасць вывезці сваіх навучэнцаў у сталіцу. Дарэчы, пасля такіх конкурсаў многія з лаўрэатаў паступаюць не толькі ў Інстытут тэалогіі, але і на журфак, філфак ці гістфак.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ВІНШУЕМ!

# Юбілей службы аховы і бяспекі БДУ



**Урачысты сход, прысвечаны 20-годдзю службы, прайшоў 10 сакавіка ў БДУ.** Удзел у мерапрыемстве ўзялі прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце ***Уладзімір Рагавіцкі***, а таксама ўвесь склад службы аховы і бяспекі. З дакладам пра вынікі працы выступіў начальнік САіБ ***Вячаслаў Трафімычаў***. У гэты святочны дзень адбылося ўзнагароджанне супрацоўнікаў службы за шматгадовую і плённую дзейнасць. Завяршылася мерапрыемства святочным канцэртам.

АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, фізічнай інфарматыкі і атамна-малекулярнай фізікі, радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, інфармацыйных сістэм кіравання, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, тэарэтычнай і прыкладной механікі, клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, кітайскай філалогіі, тэорыі літаратуры, менеджменту і эканомікі сацыяльнай сферы,

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: шматпрацэсарных сістэм і сетак, вышэйшай алгебры і абароны інфармацыі, матэматычнай кібернетыкі, фізічнага выхавання і спорту, тэорыі функцый, клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, інжынернай геалогіі і геафізікі, тэорыі літаратуры, сацыялогіі, міжнароднага менеджменту, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, замежнай журналістыкі і літаратуры, гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ, літаратурна-мастацкай крытыкі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, інтэлектуальных сістэм, інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, фізікі і аэракасмічных тэхналогій, вышэйшай матэматыкі, інфармацыйных сістэм кіравання, тэарэтычнай і прыкладной механікі, тэорыі функцый, неарганічнай хіміі, арганічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, фізічнай хіміі, дынамічнай геалогіі, інжынернай геалогіі і геафізікі, агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі, глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм, прыкладной лінгвістыкі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, паліталогіі, аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі, мовазнаўства і краіназнаўства Усходу, дызайну, культуралогіі, экалогіі чалавека, гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ, перыядычнага друку, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання, тэорыі і метадалогіі журналістыкі,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: педагогікі і праблем развіцця адукацыі, фізічнага выхавання і спорту, сістэмнага аналізу і камп'ютарнага мадэлявання, фізікі і аэракасмічных тэхналогій, дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, тэхналогій праграмавання, тэорыі функцый, фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій, прыкладной лінгвістыкі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, псіхалогіі, філасофіі і метадалогіі навукі, банкаўскай эканомікі, інфармацыйных тэхналогій, менеджменту і эканомікі сацыяльнай сферы, нямецкай мовы, агульнай і клінічнай псіхалогіі, літаратурна-мастацкай крытыкі, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання,

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: фізічнага выхавання і спорту, эканамічнай геаграфіі замежных краін, тэорыі і практыкі перакладу,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, тэарэтычнай фізікі і астрафізікі, інтэлектуальных сістэм, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, тэарэтычнай і прыкладной механікі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А.Д.САХАРАВА БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ біяхіміі і біяфізікі.

*Тэрмін падачы дакументаў – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220070 г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23, корпус 1, аддзел кадравай і арганізацыйнай працы, каб. 202, тэл. 398 88 25.*

**ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі эксперыментальнай фізікі высокіх энергій.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Урачыстае ўшанаванне пераможцаў конкурсу «Жанчына года БДУ» прайшло ў БДУ** – zviazda.by (01.03), Мінск-ТБ, АНТ (02.03).

**Праца Юрыдычнай клінікі БДУ па аказанні бясплатнай юрыдычнай кансультацыі** – minsknews.by, zviazda.by (24.02), АНТ (07.03), СТБ (09.03).

**Беларуская студэнцкая юрыдычная алімпіяда адбылася ў БДУ** – БелТА (02.03), АНТ (03.03).

**Пра конкурс вусных выступленняў на японскай мове ў БДУ** – edu.gov.by (01.03), wuz.by (07.03), zviazda.by, minsknews.by (09.03), радыё «Сталіца» (10.03).

**Праект «Cv.bsu.by» – «Рэзюмэ выпускнікоў» БДУ** – БелТА, minsknews.by, mir.pravo.by (15.03), sb.by, edu.gov.by (16.03), zviazda.by (17.03 ).

**Урачыстая цырымонія перадачы факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» бібліятэцы Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ** – БелТА (02.03), Мінск-ТБ (10.03).

**Адкрытая алімпіяда па сусветнай эканоміцы сярод студэнтаў упершыню прайшла ў БДУ** – tut.by, 21.by, wuz.by (16.03).

**Конкурс «Містар International» сярод замежных студэнтаў БДУ** – zviazda.by (13.03), Мінск-ТБ, АНТ (16.03), minsknews.by (17.03).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# БДУ ў эфіры

**На галоўных мерапрыемствах БДУ вы абавязкова заўважыце юных, актыўных хлопцаў і дзяўчат, на чыіх футболках красуецца лагатып Студэнцкага тэлебачання БДУ. Яны бяруць інтэрв'ю ў самых цікавых людзей універсітэта, бегаюць з камерай, спрабуючы зняць найлепшыя моманты, і мантуюць днямі і начамі, каб распавесці нам пра галоўныя падзеі нашай alma mater.**





Студэнцкае тэлебачанне БДУ створана на базе навучальнай лабараторыі эксперыментальнай аўдыявізуальнай праграмы Інстытута журналістыкі. Пра пачатак працы праекта ўпершыню было абвешчана на зімовай школе журналістыкі 2016 года, дзе каманда тэлеканала падрыхтавала і паказала ролік пра мерапрыемства. Вялікую дапамогу дадзенай ініцыятыве аказалі дырэктар Інстытута журналістыкі **Сяргей Дубовік**, яго намеснік **Вольга Самусевіч** і дырэктар Медыяцэнтра БДУ **Павел Салаўёў.**

Для пошуку юных талентаў быў праведзены кастынг, на які было пададзена больш за 100 заявак. Кастынг праходзіў у тэлецэнтры БДУ. Кандыдаты, якія прэтэндавалі на ролю карэспандэнтаў, паказвалі, як яны ўмеюць працаваць перад камерай, а аператары распавядалі пра сваю тэхніку і дэманстравалі свае навыкі працы ў відэарэдактарах.

«Да карэспандэнтаў мы прад'яўляем высокія патрабаванні: у іх павінна быць выразная дыкцыя і разняволенасць. Яны павінны ўмець думаць, аператыўна на месцы пісаць закадравы тэкст. Ідучы на здымкі, карэспандэнты прадумваюць сюжэт, менавіта яны вырашаюць, што і як здымаць», – распавядае пра кастынг дырэктар канала **Аляксандр Рудніцкі.**

Па выніку кастынгу была сфарміравана рэдакцыя і яе структура. Галоўным рэдактарам з'яўляецца студэнтка Інстытута журналістыкі **Юлія Вараб'ёва,** яе намеснікам **Ілья Пазняк.** На канале 28 работнікаў, якія сумяшчаюць працу карэспандэнта і аператара. У Інстытуце журналістыкі ім даюць штатыў і пятлічку, тэхніку для здымак яны выкарыстоўваюць сваю.

Аснова рэдакцыі – гэта студэнты факультэта журналістыкі, ёсць студэнты біялагічнага, геаграфічнага, філалагічнага і іншых факультэтаў. Усіх іх аб'ядноўвае любоў да тэлебачання і жаданне займацца творчасцю. Яны наведваюць розныя мерапрыемствы, размаўляюць з цікавымі людзьмі, а таксама праходзяць станаўленне ў якасці карэспандэнтаў, тэлевядучых, тэлеаператараў і мантажораў.

«Наша галоўная мэта цяпер – гэта павышэнне якасці і колькасці сюжэтаў. Напачатку працы праекта мы выпускалі дзесяці адзін рэпартаж на тыдзень, але ўжо з лютага гэтага года ў нас за тыдзень выходзіць у эфір па 4-5 сюжэтаў. Акрамя таго мы ўзмацнілі жорсткасць патрабаванняў да якасці здымак і мантажу відэа. Калі студэнты толькі прыйшлі ў рэдакцыю, яны не заўважалі дэталяў: дзесьці камера тузанулася, дрэнна запісаўся гук. Цяпер яны зважаюць на ўсе нюансы. Мы імкнёмся да паляпшэння якасці карцінкі, каб гук быў запісаны на пятлічку, камера была на штатыве, абавязкова патрэбная стабілізацыя карцінкі пры мантажах. Студэнты актыўныя, матываваныя і галоўнае – хочуць развівацца і атрымліваць веды, яны разумеюць: ёсць да чаго імкнуцца, таму не стаяць на месцы», – распавядае Аляксандр Рудніцкі.

Кур'еры і каардынуе працу канала ў інфармацыйнай прасторы ўніверсітэта Медыяцэнтр БДУ. Калі ва ўніверсітэце адбываецца значная падзея, студэнцкае тэлебачанне запрашаюць прыняць удзел у асвятленні мерапрыемства. Тады галоўны рэдактар шукае карэспандэнтаў і аператараў, якія і адпраўляюцца на заданне. Калі сюжэт адзняты і змантаваны, яго праглядае галоўны рэдактар, а далей ён ідзе на ўхвалу да дырэктара канала. Кожны сюжэт правяраецца вельмі старанна, выпраўляецца пасекундна і толькі пасля гэтага прапануецца гледачу.

Студэнты таксама прапануюць і рэалізоўваюць свае ідэі і праекты. Хоць часам задуманае складана ажыццявіць з-за недахопу камер і іншага абсталявання.

Журфак-ТВ і студэнцкае тэлебачанне запусцілі конкурс для абітурыентаў. Дзеці, якія хочуць паступіць на журфак, дасылаюць свае відэапрацы, іх разглядае адмысловая камісія, і найлепшыя з гэтых прац будуць адабраны для эфіру. Школьнікі таксама атрымаюць эфірную даведку, якая дасць ім перавагу пры паступленні.

Калі казаць пра планы, то ў студэнцкага тэлебачання яны амбіцыйныя: да канца 2017 года павялічыць аўдыторыю да 400 падпісантаў у групе «УКантакце» і 100 на канале youtube, запусціць новую рубрыку Hard Monday's Night інтэрв'ю з цікавымі людзьмі, правесці яшчэ некалькі кастынгаў і майстар-класаў. А ў марах – стварыць карэспандэнцкія пункты на ўсіх факультэтах універсітэта, каб напоўніцу адлюстроўваць сапраўднае студэнцкае жыццё, а таксама прыцягнуць больш гледачоў.

«Сапраўднае майстэрства да журналіста прыходзіць з досведам, і я не ўяўляю, дзе яшчэ такі досвед я магла б атрымаць. Я навучылася размаўляць з людзьмі, пераадольваць страхі і сарамлівасць. Таксама я навучылася камунікаваць з калектывам у якасці галоўнага рэдактара. І я ўпэўнена, што ў маёй кар'еры мне гэты досвед вельмі дапамажа», – падзялілася з «Універсітэтам» Юлія Вараб'ёва.

Паглядзець сюжэты студэнцкага тэлебачання БДУ, а таксама даведацца пра іх больш вы можаце ў групе «УКантакце» https://vk.com/bsustudtv, на ютюб-канале https://www.youtube.com/channel/UCpl7VFfruK2TroGa6e1FJkQ і на сайце http://studtv.bsu.by/.

**Дар'я КОЎЗА**

У ПРАФКАМЕ

# Студгарадку прапанавалі…

Яшчэ больш фота
gazeta.bsu.by

**Круглы стол па жыллёва-побытавых пытаннях прайшоў 14 сакавіка ў БДУ з удзелам дырэктара Студэнцкага гарадка Алы Мелех і прадстаўнікоў пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў ВНУ. На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні, якія тычацца ўмоў пражывання ў інтэрнатах БДУ, арганізацыі кампаніі па засяленні навучэнцаў у інтэрнаты на 2017/2018 навучальны год і інш.**




Фота Аляксандры РАДЗЬКОВАЙ

Удзельнікі круглага стала маглі задаць пытанні з прывядзеннем пэўных выпадкаў, прыкладаў і апісаннем праблем, а таксама ўнесці прапановы для далейшай сумеснай распрацоўкі варыянтаў іх рашэнняў.

У цэлым, прадстаўнікі факультэтаў, якія пражываюць у інтэрнатах, задаволены ўмовамі пражывання, асабліва пасля будаўніцтва новых інтэрнатаў БДУ, але былі агучаны і наяўныя праблемы, што закранаюць пражыванне ў інтэрнатах № 1 і 10. Асноўныя пытанні – гэта належны тэмпературны рэжым, захоўванне і выкарыстанне электранагравальных прыбораў у пакоі, блоку; гарачай вады ў начны перыяд.

На ўсе пытанні Ала Мелех дала падрабязныя кампетэнтныя адказы.

Дарэчы, у філіял «Мінскія цеплавыя сеткі» РУП «Мінскэнерга» Студэнцкі гарадок БДУ ўжо накіраваў запыт на падтрыманне аптымальнага нармаванага ціску ў сістэме ацяплення шматпавярховай «дзясяткі». Ідзе ўзгадненне праекта капітальнага рамонту будынка, і ў хуткім часе інтэрнат 1998 года ўводу ў эксплуатацыю зачыняць. Таксама была ўнесена прапанова накіраваць у філіял магчымую змену тэрмінаў планавага адключэння гарачага водазабеспячэння на прафілактыку ў студэнцкіх інтэрнатах на вуліцы Курчатава, дзе знаходзяцца інтэрнаты БДУ № 3 і 10.

Прагучалі прапановы ад факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, юрыдычнага факультэта ў некаторыя пункты правілаў пражывання ў інтэрнатах для навучэнцаў БДУ: пытанні прапускнога рэжыму ў перыяд канікулаў, што тычацца правоў і абавязкаў тых, хто пражывае, удзелу студэнтаў у грамадска-карыснай працы, працы некаторых органаў студэнцкага самакіравання студэнцкага гарадка, куды ўваходзяць прадстаўнікі прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ: савет па прафілактыцы парушэнняў правілаў пражывання ў інтэрнатах для навучэнцаў БДУ, студэнцкая служба бяспекі; у палажэнні, якія рэгламентуюць іх працу, і іншых дакументаў, якія рэгулююць сферу жыллёва-побытавых адносін навучэнцаў.

Таксама Ала Мелех агучыла змены і дадаткі ў пералік крытэрыяў атрымання жылога памяшкання ў інтэрнатах для навучэнцаў БДУ на 2017–2018 навучальны год, які штогод удасканальваецца на карысць навучэнцаў, улічваючы ўсе прапановы ад прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ.

Як вынік, далейшыя рашэнні пытанняў, у тым ліку тых, якія ўжо накіраваны ў адпаведныя інстанцыі, будуць разгледжаны і агучаны пры наступнай сустрэчы з прадстаўнікамі Студэнцкага гарадка БДУ.

Ала Уладзіміраўна шчыра падзякавала прафсаюзнаму актыву, які займаецца жыллёва-побытавай працай, за іх намаганні, адказнасць і дапамогу, адзначыла прадуктыўную сумесную працу з прафсаюзным камітэтам студэнтаў.

**Дар'я СПЯЦАНАВА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

22 сакавіка 2017 года
Падпісана да друку 20.03.2017 г.
Зак. 101. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***